

ГАЛОЎНЫ МАСКВІЧ ПЕРШАГА АЙЧЫННАГА КІНО 9

АРХІТЭКТАР ПАМЯЦІ 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 САКАВІКА 2020 г. АЎТОРАК № 62 (29176)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Тыдзень лесу» — выдатная акцыя, якая штогод аб'ядноўвае вялікую колькасць людзей, галоўным чынам праз свой глыбокі змест. Кожны ўдзельнік мае магчымасць зрабіць свой пасільны ўнёсак у фарміраванне багацця наступных пакаленняў беларусаў. Гэта своеасаблівае пасланне тым, хто прыйдзе сюды пасля нас. Яго сэнс зводзіцца да простых ісцін: берагчы прыроду, заўсёды думаць пра тое, што застанецца пасля нас, і любіць нашу краіну».*

# БЯРОЗАВІК У ЗАПАС



Фота БелТА.

**Аператар Юрый ЖЫЖЫЯ кантралюе якасць прадукцыі.**

**На Быхаўскім кансервава-агароднінасушыльным заводзе цяпер кансервуюць бярозавы сок новага «ўраджаю». Прычым вырабляюць яго па ўласных адмысловых рэцэптах, дадаючы чарнічны сок, шыпшыну, чабор, святаяннік, мелісу.**

## КОРАТКА

• **Алімпіяда ў Токіа пачнецца 23 ліпеня 2021 года, Параалімпіяда — 24 жніўня.**



• ЕС у сувязі з каранавірусам накіраваў 840 мільёнаў еўра краінам «Усходняга партнёрства».

• **Нацбанк рэкамендуе банкам пры рэструктурызацыі запазычанасці па крэдытах не павялічваць працэнты.**

• Ранняя ярава пасеялі ў Беларусі больш чым на 35 % плошчаў.

• **Музей гісторыі ВАВ запусціў анлайн-лекцыі для навучэнцаў.**

• У Беларусі больш за 22 тысячы сем'яў палепшылі жыллёвыя ўмовы ў 2019 годзе.

• **Беларусь абмяркоўвае з МВФ прыцягненне фінансавання ў сувязі з пагаршэннем глабальнай эканамічнай сітуацыі.**

Тэорыя і практыка

## ЭЛЕКТРАМАБІЛЬ: КВІНТЭСЕНЦЫЯ ТЭХНАЛОГІЙ

Калі Беларусь складзе канкурэнцыю TESLA, чаму «гібрыды» не вельмі цікавяць пакупнікоў і як зрабіць «разумную» машыну маленькай?



Аляксандр БЯЛЕВІЧ *(злева)* у лабараторыі бартавых мехатронных сістэм мабільных машын.

СТАР. 5

75 мірных гадоў. Беларусь памятае!

Успомніць усіх

## КАЛІ ГІСТОРЫЯ СТАНОВІЦЦА БРЭНДАМ?

### РАЗАМ МЫ СТВОРЫМ НАРОДНЫ ЛЕТАПІС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**75 гадоў мы жывём са словамі «Ніхто не забыты, нішто не забыта». Запісаны тысячы ўспамінаў, вучоныя не спыняюць даследаванні і друкуюць працы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, выдадзена 146 тамоў кнігі «Памяць», настаўнікі заахвочваюць дзяцей да даследчыцкай работы, архівы друкуюць зборнікі з дакументамі, аблічбаваныя копіі выстаўляюцца ў інтэрнэт (толькі ў электроннай базе «Партызаны Беларусі» ў найбліжэйшыя гады плануецца выкласці сотні тысяч адсканіраваных дакументаў). І тым не менш гісторыя апошняй вайны ўсё яшчэ не вывучана цалкам, не ўсе ўдзельнікі згаданы, з ростам колькасці кніг не расце цікавасць моладзі да мінулага, і ўсё часцей узнімаецца пытанне пра тое, што цяпер трэба ўжо абараняць наша права на Перамогу.**

**«Сёння савецкі салдат на Захадзе падаецца як гвалтаўнік, варвар, усё менш кажуць, што гэта вызваліцель, разбураюцца помнікі нашым бацькам і дзядам. 34 мільёны маладых здаровых мужчын было прызвана на фронт. Хто прымушаў іх ісці на таран, закрываць сваім целам дзоты? Гэта быў іх выбар. І сёння мы хочам узняць грамадскасць на высакародную справу: успомніць усіх», — тлумачыць сутнасць ідэі гісторыкаў акадэмік, сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА